УДК 947.6

І.У.Каляда, асістэнт

# ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ Ў ДЗЯРЖАЎНА-КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ БЕЛАРУСІ (1920-я ГАДЫ)

У гісторыю Беларусі 20-я гады нашага стагоддзя ўвайшлі як перыяд адраджэння, росквіту беларускай культуры і мовы. І найбольш цікавай, можна сказаць, унікальнай з'явай гэтага часу была беларусізацыя - палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Беларусізацыя праводзілася на дакладна вызначаных напрамках. Развіццё беларускай мовы было галоўным з іх. Тут быў вызначаны цэлы комплекс задач: навуковая распрацоўка праблем беларускай мовы, яе гісторыі, яе сучаснай лексікі, тэрміналогіі на аснове вывучэння народнай мовы, ставіліся задачы ліквідацыі непісьменнасці на роднай мове і вывучэння беларускай мовы гараджанамі.

Асноўная роля ў рашэнні гэтых задач адводзілася Наркамату асветы, Інстытуту беларускай культуры, адпаведным універсітэцкім кафедрам.

Агульнымі намаганнямі за кароткі час былі падрыхтаваны і выдадзены тэрміналагічныя слоўнікі па асноўных галінах навукі, распрацоўкі па лексіцы і граматыцы беларускай мовы, дапаможнікі для школ, тэхнікумаў, інстытутаў. Можна сказаць, што менавіта тады былі закладзены асновы сучаснай беларускай мовы.

Зыходным прынцыпам нацыянальнай палітыкі ў школьнай справе вызначаўся прынцып забеспячэння правоў і магчымасцей кожнай нацыянальнасці, якая пражывала на Беларусі, навучання дзяцей на роднай мове адпаведна іх удзельнай вазе ў агульнай колькасці насельніцтва і жаданню бацькоў.

Па распараджэнні Наркамасветы ў 1924-1925 гг. былі арганізаваны кароткатэрміновыя курсы беларусазнаўства, пры ВНУ адкрываліся спецыяльныя кафедры па вывучэнні Беларусі (гісторыі, геаграфіі, мовы, літаратуры і г.д.). Пры замяшчэнні вакантных пасадаў прафесараў, выкладчыкаў і іншых навуковых супрацоўнікаў перавага аддавалася тым, хто ведаў беларускую мову.

Да 1928 г. каля 80 % школ было пераведзена на беларускую мову навучання. Разам з тым адчыняліся школы і класы з роднай мовай выкладання для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей: рускай,польскай, яўрэйскай, украінскай і іншых. У 1927 г. выкладанне ў школах Беларусі вялося на 8 нацыянальных мовах. На беларускую мову была пераведзена частка прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, тэхнікумаў. На рабфаках, у вячэрніх школах для дарослых, школах рабочай і сялянскай моладзі ўводзілася абавяз-

ковае вывучэнне гісторыі, эканомікі і геаграфіі Беларусі, беларускай мовы і літаратуры. Выкладанне гэтых і некаторых іншых дысцыплін у вышэйшых навучальных установах паступова пераводзілася на беларускую мову, якая на ўсіх факультэтах вывучалася абавязкова.

Да канца 20-х гадоў значна ўзмацнілася навуковая база ВНУ рэспублікі, тым самым забяспечвалася падрыхтоўка як кадраў спецыялістаў-практыкаў, так і маладой беларускай прафесуры,якая разам з вучонымі, прыехаўшымі ў БССР па запрашэнні ўрада, склала даволі значны на той час інтэлектуальны патэнцыял беларускай навукі, якая нараджалася.

Беларусізацыя партыйных, дзяржаўных, грамадскіх органаў і арганізацый прадугледжвала вывучэнне супрацоўнікамі беларускай мовы (пры абавязковым валоданні рускай) і перавод на яе справаводства. Планамерны перавод справаводства на беларускую мову пачаўся з 1924 г. Пры ЦВК БССР была створана Нацыянальная камісія для праверкі ведання беларускай мовы ва ўрадавых установах рэспублікі. Пры гэтым вялася праверка падрыхтаванасці Народных камісарыятаў да вядзення ўсёй працы на роднай мове не толькі беларусамі, але і рускімі, яўрэямі і інш.

Для праверкі ведаў на месцах працавалі акруговыя нацкамісіі.Яны арганізоўвалі гурткі па вывучэнні беларускай мовы, курсы беларусазнаўства, дзе асаблівая ўвага звярталася на аваладанне вуснай і пісьмовай мовай, правапіс і граматыку, ставілася задача даць веды па эканоміцы, гісторыі, літаратуры Беларусі.

Да 1928 г. справаводства на беларускую мову было пераведзена амаль поўнасцю. Асноўныя ўнутрырэспубліканскія дакументы друкаваліся на чатырох мовах, агульнасаюзныя - на беларускай і рускай, грамадска-прававыя дакументы (пасведчанні і інш. ) - на беларускай і адной з трох раўнапраўных моў. Пры гэтым за кожным грамадзянінам захоўвалася права звяртацца ў любую установу на роднай мове і на ёй атрымаць адказ.

Найбольш складанае пытанне беларусізацыі - карэнізацыя. Тут лягчэй за ўсё маглі ўзнікнуць узаемныя крыўды, непаразуменні на глебе супрацьстаўлення інтарэсаў адной нацыянальнасці другой. Але ж і вырашаць яго трэба было абавязкова. Непрапарцыянальна малая адносна агульнай удзельнай вагі ў складзе насельніцтва доля беларусаў у органах улады і кіравання - становішча ненармальнае, закранаючае нацыянальны гонар, што з ростам адукаванасці і культурнага ўзроўню насельніцтва ўсведамлялася ўсё вастрэй. Тым не менш, згодна з агульнай задумкай, ставілася задача вылучэння прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на тую ці іншую пасаду не па нацыянальнай прыкмеце (беларус - не беларус), а па дзелавых якасцях, веданні ўмоў і асаблівасцей Беларусі, дасканальным валоданні беларускай і рускай мовамі. Адсюль і тэрмін - карэнізацыя.

У 1929 г. у выніку правядзення карэнізацыі становішча было такое: доля беларусаў у адміністрацыйных установах складала 51,3 %, рускіх - 18, яўрэяў - 24,8, палякаў - 0,1, іншых - 5,8 %. У цэнтральным савецкім апараце доля беларусаў складала 32,5 %, рускіх - 24,2, яўрэяў - 36,8 %. Сярод адказных работнікаў ЦК КП(б)Б беларусаў было 22,4 %, рускіх - 14,5, палякаў - 12,1, яўрэяў - 46,2, інш.- 4,8 %. Фактычна беларусізацыя ў "беларускім" сэнсе гэтага паняцця закранула толькі нізавыя органы ўлады і гаспадаркі. У вышэйшым эшалоне ўлады становішча амаль не змянілася.

Развіццё мовы і пашырэнне сферы яе ўжывання патрабавалі адпаведнай перабудовы выдавецкай справы, перыядычнага друку. Паступова павялічваліся тыражы газет і часопісаў, выпуск падручнікаў, слоўнікаў, навуковай і мастацкай літаратуры на беларускай мове. Разам з тым выдаваліся газеты і часопісы на мовах нацыянальных меншасцей. У 1928 г. з 17рэспубліканскіх газет 9 выходзілі на беларускай мове, 4- на рускай, 2 - на польскай і 2 - на яўрэйскай.

Беларусізацыя садзейнічала ўздыму ўсёй культуры, у першую чаргу літаратуры і мастацтва. У 20 -я гады на Беларусі дзейнічала некалькі літаратурных аб'яднанняў, найбольш вядомыя - "Узвышша", "Полымя". У 1924 г. пачынае сваё існавенне беларускі кінематограф. Даволі хутка развіваецца тэатральнае мастацтва. У 1921 г. - І Беларускі дзяржаўны тэатр (Е.Міровіч),у 1926 г. - ІІ Беларускі дзяржаўны тэатр у Віцебску. У 1929 г. на Беларусі ўжо 6 тэатраў (Дзяржаўны яўрэйскі тэатр, Польскі і яўрэйскі вандроўныя тэатры, а таксама Беларускі.

Можна сказаць, што ў 20-я гады быў закладзены фундамент нацыянальнага тэатра, які будаваўся на драматургіі К.Каганца, Я.Купалы, Я.Коласа, К.Буйло, Ф.Аляхновіча і інш. Тэатр нёс у масы беларускую нацыянальную культуру, праводзіў вялікую культурна-асветніцкую работу. У 20-я гады вядомым становіцца беларускае выяўленчае мастацтва (Волкаў, Пэн, Грубэ, Астановіч), для якога былі характэрны разнастайныя плыні па стылях і жанрах, творчыя пошукі новых, найбольш выразных мастацкіх формаў. Мастакі у залежнасці ад творчых памкненняў аб'ядноўваюцца ў творчыя групоўкі, удзельнічаюць у выстаўках.

Беларусізацыя абудзіла да свядомага нацыянальнага жыцця шырокія слаі насельніцтва. Магчымасць нацыянальнага адраджэння беларусаў станавілася рэальнасцю. Беларускі народ пачаў будаваць сваё жыццё на нацыянальнай глебе з улікам сваіх эканамічных і духоўных традыцый.